# Рэпрэзентацыя гістарычнай памяці ва «Успамінах з жыцця» Евы Фялінскай

«Успаміны з жыцця» («Pamiętniki z życia») польскамоўнай пісьменніцы Беларусі Евы Фялінскай з Вяндорфаў (1793–1859) даюць багаты матэрыял для вывучэння індывідуальнага асэнсавання і інтэрпрэтацыі гісторыі.

Жыццёвы шлях Евы Фялінскай выразна адрозніваўся ад традыцыйнага жаночага лёсу. Ёй давялося зведаць ранняе сіроцтва і нястачу. На дапамогу збяднелай сям'і прыйшоў сваяк Станіслаў Вяндорф, які ўзяў дзяўчынку на выхаванне ў свой заможны маёнтак на Случчыне. Поўнымі нялёгкіх клопатаў былі для Евы і гады замуства з Герардам Фялінскім, праведзеныя ў яго радавым фальварку Ваютын на Валыні. Ужо ў сталым веку, аўдавеўшы, яна перабіраецца ў Крамянец, дзе далучаецца да падпольнай патрыятычнай арганізацыі Шымана Канарскага і стварае яе філіял «Жаночае таварыства». Пасля гэтага былі арышт у 1839 годзе, ссылка спачатку ў невялікі сібірскі горад Бярозаў, потым у Саратаў. Толькі ў 1844 годзе Фялінскай дазволілі вярнуцца на радзіму. Яна стала жыла на Валыні, вяла гаспадарку, вырашала сямейныя справы і менавіта тады сур'ёзна занялася літаратурнай творчасцю. Пасля публікацыі раманаў («Герсылія», «Пан дэпутат», «Пляменніца і цётка»), у якіх яна ў рэтраспектыўным плане паказала жыццё беларускай правінцыі ў часы сваёй маладосці, пісьменніца звярнулася да мемуараў.

Унікальнасць мемуарнай спадчыны Евы Фялінскай у тым, што гэта адзіныя аўтэнтычныя мемуары сярод твораў названых вышэй аўтарак. Усе яны імкнуліся да публікацыі сваіх успамінаў, але лёс рукапісаў склаўся так, што апрача твораў Фялінскай усе тэксты былі надрукаваны пасля смерці аўтараў, моцна скарочаныя і падкарэкціраваныя выдаўцамі. Мемуарная спадчына Е. Фялінскай складаецца з аб'ёмных выданняў без купюр, якія пабачылі свет пры жыцці пісьменніцы ў 50-я гады XIX стагоддзя: трохтомныя «Успаміны з падарожжа па Сібіры і побыту ў Бярозаве і Саратаве», дзе пісьменніца распавядае пра доўгія падарожжы па расійскіх абшарах і жыццё ў ссылцы. Найбольш моцны літаратурны складнік маюць пяцітомныя «Успаміны з жыцця», якія ўвабралі ўражанні ад ранняга дзяцінства пісьменніцы да 1821 года.

Калі мемуарна-біяграфічныя творы Г. Герыч, А. Пакаш, Г. Пузыні і А. Скірмунт арыстакратычныя, аднаўляюць жыццё вярхоў грамадства, малююць шумнае свецкае жыццё сталіцы і постаці выбітных прадстаўнікоў краю, то ўспаміны Е. Фялінскай паказваюць яе дзяцінства і маладосць, праведзеныя сярод беднай і сярэдняй шляхты на Случчыне і Ігуменшчыне, у глыбокай правінцыі, куды запознена далятае рэха гістарычных падзей. Яе мемуары высвечваюць мінулае з такога боку, які найчасцей не ўваходзіць

у склад афіцыйнай гісторыі, асвятляюць найперш з'явы прыватныя, партыкулярныя, якія ніяк не падпадаюць да катэгорыі гістарычна вызначальных. Гэты факт ускосна сведчыць пра дэмакратычнасць мемуарнага жанру, яго агульнадаступнасць не толькі ў плане ўспрыняцця і разумення тэксту успамінаў – любая асоба, усвядоміўшы значнасць свайго жыццёвага вопыту, можа ўзяцца за стварэнне мемуарна-біяграфічных твораў.

Няспешлівы тон апавядання, трапнасць адабраных з рэчаіснасці фактаў і дэталёвасць іх апісання нараджаюць у чытача давер і адчуванне далучанасці да даўно мінулага жыцця, перадаюць непаўторны водар эпохі. Ю. І. Крашэўскі, высока ацаніўшы твор Е. Фялінскай, пісаў: *Гэта выдатны вобраз часоў малавядомых…свежы і экстрапраўдзівы* [12, s. 250].

Каштоўнасць «Успамінаў» Евы Фялінскай шмат у чым абумоўлена ўнікальнай эпохай, якая знайшла сваё ўвасабленне ў творы. Гэта час глыбінных перамен ва ўсіх сферах жыцця Літвы-Беларусі на пераломе XVIII – пачатку XIX стагоддзяў, калі ў выніку змены культурна-гістарычнай парадыгмы адбывалася развітанне краіны з традыцыйным ладам і яе ўваходжанне ў агульнаеўрапейскае рэчышча. Па-мастацку вобразна і дакладна ўваскрасаючы характэрныя абразкі дынамічнай эпохі, аўтарка аналізуе страты і набыткі ў працэсе пераходу ад старасвецкіх і нацыянальна-каларытных да касмапалітычных і па-еўрапейску ўніфікаваных форм жыцця. Маладосць Е. Фялінскай была сведкам такіх значных перамен у свядомасці, звычаях, побыце, грамадскіх і міжчалавечых стасунках, што, па словах пісьменніцы, стваралася ўражанне, *як быццам мы бачылі дзве асобныя цывілізацыі, якія выраслі з рознага кораня, або былі падзеленыя мноствам стагоддзяў і сфарміраваны цалкам адрознымі акалічнасцямі* [8, s. 7] (Тут і далей пераклад наш. – *І. Б.*).

Ева Фялінская вылучаецца спеласцю свядомасці пісьменніцы-мемуарысткі, якая разумее важнасць сваіх успамінаў для пазнання і асэнсавання гістарычнага працэсу. На пачатку твора яна падкрэслівае: *Пражыўшы 60 гадоў, далучыўшыся да розных грамадскіх слаёў, жывучы ў эпоху дзіўных і няпростых перамен не толькі ў нашым краі, але і ў іншых землях, я на свае вочы бачыла, як наша грамадства, падлеглае моцным знешнім і ўнутраным уплывам, раптоўна пераўтварылася, адкідаючы даўняе аблічча і набываючы новае. Можа, я здолею затрымаць сваімі ўспамінамі некалькі малюнкаў, якія цалкам зніклі з нашай зямлі, але аднак з'яўляюцца тым звяном, што лучыць мінулае з цяперашнасцю, тлумачаць прычыну пераменаў, якія мы бачым сёння, не разумеючы дакладна прычын, якія іх нарадзілі* [8, s. 6–7]. На яе думку людзі, відавочцы такіх імклівых змен, нясуць выключную адказнасць перад нашчадкамі, бо яны павінны сваімі ўспамінамі звязаць разначасовыя з'явы пераўтварэння грамадства, *каб наступныя пакаленні не адракліся ад мінуўшчыны з настолькі інакшым*

*абліччам і не глядзелі на яе з абыякавасцю, як на чужаземку, з якой не мелі і не маюць нічога супольнага* [8, s. 8]. Натуральна, што для любога мемуарнага твора катэгорыя часу з’яўляецца ключавой, звязанай з чарадой падзей і зменай жыццёвых этапаў героя-апавядальніка. Час у мемуарах Е. Фялінскай не проста біяграфічны. Пісьменніцы ў поўнай меры ўдалося перадаць працэсуальнасць гісторыі, стварыць абагулены вобраз сваёй пераменнай эпохі, якая адзначалася розніцай культурных патэнцыялаў, што нараджала дынаміку і зменлівасць усіх форм жыцця.

Пісьменніца называе перыяд сваёй маладосці часам разбурэння і дэзарганізацыі і выяўляе сапраўдны старашляхецкі фундаменталізм. Прычыну ўсеагульнага заняпаду яна бачыць у безаглядным наследаванні заходнееўрапейскім узорам, найперш *зматэрыялізаванай Францыі*. Дэструкцыя пачалася са змены маральна-этычных арыенціраў, разбурэння старой сістэмы каштоўнасцей, адмаўлення ад нацыянальнай самавітасці. Новыя павевы, запазычаныя традыцыі прынеслі краіне *спусташэнне большае, чым татары, бо татары, разрабаваўшы, не знішчалі маральных нормаў. Ім ніхто не збіраўся следаваць* [8, s. 419].

Памяць Е. Фялінскай зафіксавала апошнія праявы патрыярхальнага жыцця. Даўжэй за астатніх старых звычаяў трымаўся сярэдні слой шляхты, да якога належала сям’я дзядзькі Станіслава Вяндорфа. У яго доме Фялінская выхоўвалася з 7 год да самага замуства. Дзядзька свядома не пераймаў чужаземных павеваў і сваю гаспадарку ў Галынцы і прылеглых вёсках вёў па-ранейшаму. Здавалася, ён не праяўляў асаблівай актыўнасці, большую частку дня моўчкі седзячы ў гасцінным пакоі, але ўся гаспадарчая махіна, раз і назаўсёды запушчаная на пэўны лад, трымалася дысцыплінай, пачцівасцю і працавала бесперабойна. Фялінская і дагэтуль дзівіцца дабрабытам Галынкі. Фальварак функцыянаваў як натуральная самадастатковая гаспадарка, у якой нічога не прадавалася, а даход ішоў выключна на ўтрыманне дому. Цукар, канфіцюры, каву і віно, купленыя за жывыя грошы, падавалі толькі ў рэдкіх выпадках асаблівым гасцям. Але ўсё, што мелі самі, ужывалі ў вялікім мностве – хапала і гаспадарам, і збяднелым сваякам, і шматлікім рэзідэнтам, а рэшту, каб не псавалася, раздавалі па вёсках. Кожную нядзелю пасля імшы ў касцёле цётка запрашала на абед усю навакольную шляхту, не зважаючы ці гэта заможны сусед, ці шляхціц на загродзе. У Галынцы накрывалі багаты стол, які ламіўся пад неверагоднай колькасцю ежы, згатаванай выключна з прадуктаў свайго фальварка. Не было адмысловых прысмакаў, выкшталцоных далікатэсаў, гаспадары не хваліліся багатай сервіроўкай, але затое панавала гасціннасць, сардэчнасць, жаданне падзяліцца дарамі Божымі з усімі. *Дробная шляхта благаслаўляла гасціннасць дому. Нават калі пасля абеду разыходзіліся па групках, гаспадыня пасылала то*

*мёду, то піва, каб не бавіліся насуха і бачылі, што пра іх дбаюць*. [8, s. 225]. Такія нядзельныя абеды, якія гуртавалі ўсю навакольную шляхту, Фялінская апісвае яркімі сакавітымі фарбамі, не адмаўляючы сабе ў задавальненні спыняцца на найбольш каларытных шляхецкіх постацях.

Формы бытавога жыцця мяняліся літаральна на вачах. Успамінаючы святочныя застоллі ў дзядзькавай сям'і, Фялінская параўноўвае іх з велікодным сталом, які ладзіла праз дзясятак гадоў адна з дачок Вяндорфа. Жыццё набыло за гэты час больш далікатныя і мяккія рысы. Калі раней клапаціліся пра колькасць і разнастайнасць ежы, праўда, не спажывалі экзатычных далікатэсаў кшталту страсбургскага паштэту, то цяпер акцэнт змяніўся: стол быў густоўна ўбраны, елі з замежнай парцэляны, ды і самі стравы сталі больш адмысловымі, але тым не менш не было ўражання ранейшага дабрабыту і шчодрасці. Больш увагі пачалі надаваць форме, занядбаўшы пры гэтым змест застолля: не адчувалася ўжо ранейшай шчырай гасціннасці, знікла былая шляхецкая супольнасць. Час змяніўся, традыцыі распаліся, і кожны ўжо быў сам па сабе.

Пісьменніца параўноўвае гаспадарку Галынкі з бяздоннай бочкай, у якой ніхто не бачыў пустога дна. Куды ж падзелася былое багацце і дабрабыт потым? *Здавалася, што раней ламалі галаву як бы найбольш спажыць дароў божых. Як іх найбольш заашчадзіць стала клопатам пазнейшых гаспадароў*, – піша аўтарка [8, s. 236]. Як даводзіць Фялінская, эканамічныя праблемы ўзніклі ў выніку сляпога пераймання чужой цывілізацыі, у тым, што гаспадарку пачалі весці без уліку асаблівасцей мясцовасці і клімату, назапашанага ўласнага вопыту. Але ж *гісторыя стварыла для французаў свае формы жыцця, для нас свае. А мы іх бяздумна адкінулі* [8, s. 416].

Ева Фялінская прысутнічае ў творы і як гераіня апавядання, арганічна ўпісаная ў стракатую канву падзей і разнастайных здарэнняў, і як наратарка, якая аналізуе, абагульняе шматлікія праявы грамадскага, эканамічнага, культурнага, сямейна-побытавага жыцця, акрэслівае вядучыя тэндэнцыі, вызначае прычынна-выніковыя сувязі паміж былым і пазнейшым часам. Так, напрыклад, свае ілюстрацыі з жыцця шляхецкіх фальваркаў яна падмацоўвае падрабязнымі развагамі пра перавагі натуральнай гаспадаркі. Аўтарка разумее, што зараз гаворка пра падобную патрыярхальшчыну рассмяшыла б любога эканаміста, але для яе патрыярхальнае амаль тоеснае нацыянальнаму і патрыятычнаму, і таму нават у такой старажытнай форме гаспадарання знаходзіць свае плюсы. На яе думку, нацэленасць на ўжыванне ў асноўным сваёй прадукцыі прыводзіла да ўдасканалення і развіцця мясцовага рольніцтва і прамысловасці. Жывучы выключна са сваёй гаспадаркі, пан увесь набытак і багацце ўкладаў у яе развіццё. У іншых еўрапейскіх краінах працэс спажывання па-ранейшаму меў патрыятычны характар, бо заможныя людзі куплялі айчынныя вырабы і тым самым падтрымлівалі сваіх вытворцаў.

У нашым краі з пранікненнем заходніх стэрэатыпаў усё пайшло наадварот: нацыянальныя інтарэсы былі адкінуты, магнаты свае дамы пачалі пераносіць за мяжу, цягнучы з вёскі апошнія сокі. Шляхта атрымлівала даходы пераважна з працы сялян, але грошы марнавала на тое, што не мела да вёскі ніякага дачынення. Прайшло няшмат часу, і нават небагаты шляхціц лічыў неабходнымі ва ўласным доме гарбату, самавар і іншыя патрэбныя для самапрэзентацыі прывазныя рэчы. *І ў выніку хоць зараз і сеем больш і больш прадаём, а тым не менш у шляхецкіх дварах паўсюль разлік і можна сказаць беднасць, а няшчасны селянін не мае сіл на ўласную гаспадарку і галее сам* [8, s. 416]. Трывогу і непакой Е. Фялінскай падзяляе і вядомы пісьменнік І. Ходзька, які ў сваім папулярным творы «Самавар» іранічна паказвае, як валоданне гэтай моднай рэччу пераўтвараецца ў акт сцвярджэння самасці і заможнасці.

Дзякуючы спалучэнню такіх жанрава-родавых рыс, як рэтраспектыўнасць і памяць, эгадакументы дапамагаюць выявіць канкрэтныя формы быцця і спосабы мыслення розных сацыяльных груп грамадства. Фялінская падае пластычныя малюнкі побытавага жыцця беларускай правінцыі, стварае галерэю разнастайных шляхецкіх тыпаў ад «кунтушовай» шляхты да моладзі, якая кіравалася заходнееўрапейскімі ўзорамі. Падкрэсліваючы зменлівы характар свайго часу, яна піша, што нават у абліччы і ў фізіяноміі паміж дзядамі і ўнукамі выявілася такая вялікая розніца, *як быццам чужое племя прыйшло на нашу зямлю і тут засялілася*. Зніклі маляўнічыя постаці, мужныя і моцныя, нібы народжаныя да слуцкага пояса, жупана і шаблі. *Сёння толькі на партрэтах можна ўбачыць ранейшыя твары, але памяць мая досыць затрымала іх з натуры. Аднак, трэба прызнацца, што ўжо ў часе маёй маладосці рэформа ішла шпаркім крокам. Усё працавала на пераўтварэнне. Нават многія сталыя і нават старыя людзі адышлі ад даўняй прастаты і звычаяў, і, скінуўшы кунтуш, беглі следам за іншымі, бо гэты шлях здаваўся ім больш лёгкім і прыемным* [10, s. 257]. Глыбінныя змены ў грамадстве пацягнулі за сабой і перамены ў людскім абліччы: *цяперашнія мужчыны ўжо не набудуць мужнасці і гарту, седзячы ў мяккім фатэлі на спружынах, ужываючы прысмакі і марачы пра пахудзенне. Сёння знікла патрэба ў мужнасці, з’явілася спакойнасць і стабільнасць. Асноўнымі сталі добры быт, выгоды і зручнасць* [10, s. 258].

Жаночыя мемуары ў сілу сваёй інтравертнасці як правіла пазбягаюць закранаць тэмы высокай палітыкі, але затое звяртаюцца да праблем быццам і маргінальных, але тым не менш жыццёва важных і агульназразумелых. Фялінская гаворыць пра перамены, якія адбыліся ў жаночай модзе, і гэты аспект побытавага жыцця не менш доказна, чым гаворка пра гаспадарча-эканамічныя ці палітычныя працэсы, ілюструе прынцыпова новыя змены часу. Раней золата і каштоўнасці, заўважае пісьменніца, былі сведчаннем

багацця дому і служылі для рэпрэзентацыі сваіх гаспадароў, таму старадаўнія сукні шыліся з дарагой тканіны, аздабляліся ўпрыгожаннямі і каштавалі вялікія грошы. Такіх сукняў нават у заможнай гаспадыні было няшмат, яны захоўваліся і перадаваліся ў спадчыну як сапраўдная каштоўнасць. Калі нарэшце такая сукенка даравалася якой-небудзь выхаванцы або беднай сваячніцы, то гэта лічылася дабрачыннасцю. Цяпер на змену дарагім тканінам прыйшлі лёгкія і танныя муслін і паркаль. Мода, тон якой задавала Францыя, стала больш сціплай і дэмакратычнай, і багатыя аздобы аказаліся цалкам непатрэбнымі. Затое модныя тэндэнцыі ўвесь час мянялася, і на розныя імпрэзы трэба было штораз прыходзіць у новым убранні. Гэта вонкавая прастата стварыла вялікую шкоду, бо падштурхнула шляхту намагацца быць падобнымі на магнатаў. Калі раней паміж імі была адназначная маёмасная мяжа, то цяпер з’явілася ілюзія дасягнуць хаця б знешняга падабенства да вышэйшых класаў. Такая бачнасць роўнасці нарадзіла бясконцую пагоню за модай, якая разарыла не адзін шляхецкі маёнтак. *Усё змяшалася ў грамадстве, усё парушылася як Бог стварыў, першапачаткова прызначыўшы кожнай частцы цэлага сваю ролю. Роўнасць нарадзіла канкурэнцыю, і цяпер кожнаму здавалася, што ён можа прарвацца наверх, мусіраваліся такія чалавечыя якасці, якія не былі ўласцівымі нацыянальнаму характару: сквапнасць, зайздрасць, няўдзячнасць… Калісьці рыцарская шляхта мела цяпер аднаго бога – грошы* [9, s. 141].

Вялікую долю віны ў разбурэнні краіны Фялінская ўскладае на магнатэрыю, якая забылася на сваё прызначэнне гуртаваць вакол сябе шляхту, быць яе апекуном і правадыром. Пісьменніца дазваляе зазірнуць у двор клецкіх Радзівілаў і робіць гэта пасрэдніцтвам дзядзькі, які да позняй старасці захоўваў абавязак добраахвотнага клопату аб інтарэсах княскага дому. Кожную нядзелю, урачыста апрануты, ён наведваў іх рэзідэнцыю ў Радзівілімонтах. Калісьці магнацкія асяродкі трымалі ў цэльнасці ўсю шляхецкую супольнасць, у іх выспяваў грамадскі дух, фармаваліся думкі і погляды. Пазней, як адзначае Фялінская, калі часы змяніліся і Радзівілы ўжо не значылі так многа ў грамадска-палітычным жыцці, усё роўна застаўся такі звычай, які скончыўся смерцю адных і заступленнем на іх месца малодшых пакаленняў. Але гэта ўжо была хутчэй даніна традыцыі, *хаджэнне па звыклай сцежцы*. Шляхта, якая па нядзелях з’язджалася да Радзівілаў, *сустракалася нібы на цвінтары, каб разам замовіць пацеры па памерлых, бо ўсе адчувалі, што гэта апошнія водбліскі дагараючага вогнішча, у які ніхто не мае ахвоты падкінуць палiва* [9, s. 231]. Жыццё магнацкіх двароў аўтарка параўноўвае з заведзенай спружынай гадзінніка. Пакуль яна заведзена, механізм рухаецца і жыццёвы працэс ідзе. Спружына развілася – і рух спыніўся. Рэлікты старасвеччыны сапраўды быццам паступова пазбаўляліся энергіі. Гэта найлепш відаць на бацьку і сыне клецкіх Радзівілах. Калі

стары ваявода пасля абеду засынаў, то замест сябе пакідаў сына, які таксама драмаў, седзячы ў крэсле пасярод шматлікіх наведвальнікаў. Санлівыя, дрымотныя, маларухомыя, яны былі сімваламі адыходзячай эпохі, якая ўжо не мела гістарычных перспектыў.

Новае пакаленне магнатаў, якое прэзентуе ў мемуарах Дамінік Радзівіл, выхаваныя на чужой культуры ў духу заходнееўрапейскага індывідуалізму, забыліся на сваё прызначэнне. Да маладога Радзівіла, які толькі што ўступіў у свае нясвіжскія ўладанні, па прывычцы зляцелася шляхта, але ён адмовіўся ад наканаванай традыцыяй ролі. Ён дбаў толькі пра ўласныя інтарэсы, праводзіў большасць часу ў стайні, прыбранай дарагімі кілімамі і люстэркамі, сярод любімых коней, там жа прымаў наведвальнікаў або ладзіў шумныя паляванні на суслікаў. Гледзячы на яго, шляхта пачала гнацца за выгодамі, клапаціцца пра еўрапейскі полер, патанаючы ў марнатраўстве. Е. Фялінская прыгадвае і іншых магнатаў, якія імітуюць заходніх арыстакратаў, малюе разнастайныя тыпажы шляхціцаў, хворых на панскасць, нуварышаў, што ўціскаюцца ў вышэйшыя класы. Канчаткова распаўся ланцуг, які яднаў розныя слаі насельніцтва ў грамадскую супольнасць. *Гэта была найгоршая эпоха, час дэзарганізацыі. Кожны прыклаў руку, каб знішчыць тое, што было зроблена працай духу многіх пакаленняў і аплачана многімі ахвярамі… Нішчыць проста, а вось будаваць нанова – не хапала рамеснікаў. Ад гмаху, узведзенага вякамі, засталіся бясформенныя руіны* [8, s. 258].

Новая цывілізацыя энергічна шырылася на ўсход, адцясняючы рэшткі старога ў глухую правінцыю. З вялікай цеплынёй Е. Фялінская апісвае жыццё на Бярэзіне, у фальварку Баратычы на Ігуменшчыне, куды пасля замуства пераехала яе стрыечная сястра. Над Бярэзінай захавалася болей прастаты, чым у ваколіцах Нясвіжа і Клецка, дзе тон задаваў радзівілаўскі двор. Ігуменшчына, аддзеленая густымі лясамі ад людных месцаў, не ўдзельнічала ў небяспечным руху, які дзе-ндзе называўся цывілізацыяй. Там засталіся рэшткі нацыянальнага жыцця [10, s. 233]. Пісьменніца адзначае жыццё без амбіцый і прастату нораваў мясцовых шляхецкіх сем'яў. Яна прыгадвае хатнія традыцыі, сямейныя зборы, балі, вяселлі, імяніны, пераносіны, дзе моладзь бавілася да ўпаду. Суседскія дамы прымалі мноства гасцей і пакідалі іх нанач. Жанчыны спалі ў адным пакоі, мужчыны покатам на засланай сенам падлозе ў суседнім, і ніхто не скардзіўся на нязручнасць. Салоны не аздабляліся золатам, люстэркамі, дарагой мэбляй, строі рабіліся са сціплых тканін на месцы, але ежы ніколі не бракавала, а пра замежныя прысмакі ніхто і не ведаў. Гэта былі апошнія праявы адыходзячага ў нябыт патрыярхальнага свету.

Красамоўным вынікам разбуральнага ўздзеяння чужой цывілізацыі ва «Успамінах» Фялінскай паўстае эксдывізія. Распад маральна-этычнай сістэмы каштоўнасцей, адыход ад шляхецкага традыцыяналізму і прын-

цыпаў грамадскай супольнасці прывялі да эканамічнага калапсу магнацкіх і шляхецкіх гаспадарак. Магнацкія двары, якія былі апірышчам для навакольнай шляхты, развальваліся і цягнулі за сабой іншых. Шляхта, гонячыся за магнатамі, бяздумна марнавала назапашаную пакаленнямі спадчыну. Заложаныя маёнткі аддаваліся пад эксдывізію, якая пераўтварылася ў агульнаграмадскую навалу. *Спачатку эксдывізіі мелі дзіўнае аблічча і выклікалі недаўменне; асабліва калі падалі калосы, якія існавалі здаўна і былі зрослымі з лёсам народу, чыя трываласць здавалася непахіснай, як егіпецкія піраміды. Але паволі думка звыклася, маёнткі пачалі падаць адзін за другім і засталося толькі здзіўленне, калі які яшчэ заставаўся на нагах* [10, s. 112]. Даўжнікі, крэдыторы, суддзі – усе патрапілі ў яе жэрла. На прыкладзе жыццёвых сітуацый сваіх знаёмых Е. Фялінская паказвае, як у гэтых варунках самае бруднае ў людзях пачало браць верх: даўжнікі забыліся на сорам, каб прыўлашчыць хоць трохі чужой маёмасці, ліхвяры спаборнічалі ў хцівасці, суддзі ў беспрынцыповасці і прадажніцтве. Мараль пала, знікла пачуццё таварыства і даверу. Вяскоўцы, якія прывыклі глядзець на паноў, як на апекуноў, зараз пабачылі, што яны пераўтварыліся для іх толькі ў лічбу, якая выражае пэўную колькасць грошай падчас эксдывізій.

Распад магнацкіх уладанняў і шляхецкіх фальваркаў пісьменніца трактуе па-філасофску, успрымаючы гэта як Боскую наканаванасць. У магнацкіх маёнтках яна бачыць форму, у якой у найбольш гарманічным выглядзе была ўвасаблена ідэя грамадзянскага адзінства і салідарнасці. Нават раздаючы маёнткі, магнат павялічваў сваю сілу і аўтарытэт. Фялінская параўноўвае гэта з пускам крыві хвораму чалавеку, праз што ён абнаўляецца і здаравее. Па Божай волі знікла ідэя грамадскай супольнасці, якая лучыла людзей, і форма яе ранейшага ўвасаблення пачала распадацца, як распадаецца цела чалавека пасля смерці, калі яго пакідае душа. *Адпалыя часткі пачынаюць шукаць форму, у якой яны маглі б існаваць далей ужо ў новых акалічнасцях. Але ж пакуль не знайшлі! Цяпер кожны пачаў ствараць маленькія сферы і быць іх цэнтрам, і не было больш сілы, якая б гэтыя сферы аб’яднала ў адну сістэму…Гэта стан ферментацыі, калі гэтыя часткі так і існуюць, не знайшоўшы новай ідэі. Якая яна будзе – ніхто не ведае* [10, s. 186].

Фялінская трапна характарызуе свой час, называючы яго эпохай не толькі дэзарганізацыі, але і ферментацыі, не толькі разбурэння, але і пошуку новых форм. Створаная стагоддзямі старая цывілізацыя імкліва распадалася, а новыя традыцыі яшчэ не паспелі прыжыцца і набыць акрэсленай формы, таму малюнкі энтрапіі і дэструкцыі ў творы Фялінскай пераважаюць, таму пісьменніца ўспрымае чужаземныя з’явы адназначна негатыўна. Апрача таго, патрыятычныя погляды аўтаркі безумоўна спрыялі ідэалізаванаму ўспрыняццю ўсяго старасвецкага, што было для яе тоесна нацыянальна адметнаму. Але яна не самотная ў сваіх настальгічных пачуццях. Такім

жа сумам па старасвецкіх часах і страчаных традыцыйных каштоўнасцях прасякнуты творы Я. Баршчэўсага, І. Ходзькі, Г. Жавускага, В. Дуніна-Марцінкевіча і іншых творцаў ХІХ стагоддзя.

«Успаміны з майго жыцця» – твор поліфанічны, са складанай кампазіцыйнай будовай. Займальнасць і драматычную напружанасць яму надае не толькі паказ радыкальных змен у грамадскім і побытавым жыцці беларускай правінцыі, але і інтрыга жыцця аўтаркі, якая паўстае ў мемуарным тэксце як біяграфічная асоба, як аўтар-апавядальнік і як галоўны герой твора. Нягледзячы на шырокі ахоп рэчаіснасці і інфармацыйную разнастайнасць, мемуары Е. Фялінскай выразна суб'ектна-арыентаваныя і адрозніваюцца моцным асабовым пачаткам і высокім узроўнем аўтарскага самараскрыцця. Вертыкальная арганізацыя матэрыялу дапамагае пісьменніцы не толькі зафіксаваць чаргаванне жыццёвых падзей і ўражанняў, паказаць сапраўдны калейдаскоп каларытных постацяў, але і адлюстраваць уласную духоўную біяграфію, прасачыць працэс інтэлектуальнага і эмацыянальнага сталення, яшчэ раз з адлегласці пражытых гадоў глянуць на ключавыя моманты ўласнага лёсу.

Для Е. Фялінскай стварэнне мемуараў ёсць яшчэ і актам самарэканструкцыі і самаспасціжэння. Яна піша: *Пачынаючы гэтыя ўспаміны, найменей хацела сабраць і пераказаць падзеі майго жыцця, а найбольш акрэсліць фрагмент эпохі, у якой жыла;.. але як я заўсёды была цэнтрам тых падзей, якія ахоплівала маё вока, то пазбегнуць пастаянных зваротаў да сябе з'яўляецца амаль немагчымым* [8, s. 10]. Пісьменніца адкрыта сцвярджае суб'ектыўны характар сваіх мемуараў і ў прадмове да «Успамінаў» падкрэслівае непазбежнасць эмацыянальнага перажывання мінулага, яго індывідуальнай інтэрпрэтацыі: *кожны чалавек, калі абтрасае мінулае ад пылу і ўвасквашае яго для новага жыцця, знаходзіцца пад уплывам пачуццяў і не можа іх адкінуць, каб не пазбавіць свой твор жыцця* [8, s. 10]. *Таму ў мемуарах я пакідаю вобразы, пакліканыя маёй любоўю і ажыўленыя маім духам у тым выглядзе, у якім яны паўсталі з мёртвых у маім сэрцы і ў маім уяўленні* [8, s. 10].

Пісьменніца ўдала ўплятае факты ўласнай біяграфіі ў шматкаляровае і стракатае палатно тагачаснага жыцця, куды яна ўключае шматлікія навелістычныя эпізоды, гістарычныя анекдоты, паказкі, якія служаць ілюстратыўным матэрыялам для пацвярджэння аўтарскіх думак і назіранняў. Значнае месца ў тэксце займаюць аўтарскія каментарыі і разважанні, многія з якіх носяць адкрыта дыдактычны характар, што часам шкодзіць успрыманню твора. Але гэтыя рэфлексіі прэзентуюць не толькі светапогляд мемуарысткі, але і пэўным чынам характарызуюць духоўную і інтэлектуальную атмасферу эпохі. Аўтарскія каментары, якія ўстаўляюцца

ў плынь жыцця «я»-гераіні Е. Фялінскай, зроблены пісьменніцай з вышыні пражытага жыцця і падкрэсліваюць рэтраспектыўны характар мемуараў, перапляценне ў іх сінхранічнага і дыяхранічнага аспектаў. Натуральна, аўтарскія ацэнкі і меркаванні адкарэкціраваны часам, жыццёвым вопытам, а лірычныя ўспаміны афарбаваны настальгічным пачуццём і тугой па часах маладосці: *Цяпер лепей разумею значэнне кожнай постаці, святло і цені* [8, s. 233]. Нягледзячы на шматслойнасць сюжэтна-кампазіцыйнай структуры, выкарыстанне розных нарацыйных прыёмаў, мемуары Е. Фялінскай вылучаюцца цэласнасцю і спарадкаванасцю, бо арганізуючым стрыжнем з’яўляецца рух памяці аўтаркі, скіраваны на храналагічную плынь уласнага жыцця.

Увага да ўнутранага стану, трапнасць і дэталёвасць псіхалагічнага малюнка, маналогі-роздумы і шматлікія дыялогі, настраёвыя малюнкі прыроды, успрынятыя чулай душой аўтаркі, белетрызаваныя жыццёвыя гісторыі збліжаюць мемуары Фялінскай з раманам, але пры гэтым яны не атаясамліваюцца з ім, захоўваючы жанравыя рысы аўтабіяграфічнай літаратуры. На сувязь мемуарыстыкі і псіхалагічнай прозы ў свой час звяртала ўвагу Л. Гінзбург [2, с. 12]. Пазней пра блізкасць аўтабіяграфічнай літаратуры і белетрыстыкі пісаў Л. Лосеў: «Нам падаецца, што ў асноўным мемуары ёсць разнавіднасць аднаго з жанраў мастацкай прозы, а менавіта рамана. Любы мемуарны твор – гэта раман, у якім у якасці матэрыялу выкарыстаны не фіктыўныя, а рэальныя падзеі» (цыт па [7, с. 103]).

Мемуарная проза Е. Фялінскай па мастацкім узроўні пераўзыходзіць яе белетрыстыку, якая часам заснавана на надуманых схемах – ілюстрацыях аўтарскіх канцэпцый. У мемуарах аўтарка ў першую чаргу абапіраецца не на літаратурныя штампы, а на рэальную жыццёвую аснову і ўласны досвед, разам з тым, мемуарная літаратура, не скаваная строгімі жанравымі патрабаваннямі, давала аўтарам большую свабоду для творчага самавыяўлення. Некаторыя важныя моманты ці этапы ў жыцці Е. Фялінскай, на якіх яна асабліва канцэнтруе ўвагу (напрыклад: яна – самотная дзяўчынка-сірата ў чужым доме, або яна – маладая паненка ў складанай сітуацыі сардэчнага выбару паміж некалькімі прэтэндэнтамі на яе руку, ці яна – няшчасная маці, якая хавае адно за адным сваіх дзяцей), у мемуарах адноўлены з такой эмацыянальнай насычанасцю і псіхалагічнай дакладнасцю, якая рэдка сустракаецца ў тагачаснай мастацкай літаратуры. Знаходжанне мемуараў на перыферыі мастацкай прозы, памежны характар жанру давалі прастору для мастацкіх эксперыментаў. На думку Л. Я. Гараніна, неафіцыйнае становішча мемуарных твораў мела свае перавагі: «У галіне зместу і ў галіне формы яно адкрывае шырокія магчымасці для наватарскіх увасабленняў» [1, с. 51]. Падобнай думкі прытрымліваюцца і іншыя навукоўцы. Так, Г. Г. Елізавеціна

сцвярджае, што мемуарыстыка часта становіцца «своеасаблівай літаратурнай лабараторыяй, дзе здабывалася тое новае, што потым узбагачала іншыя жанры» [3, с. 163]. Такім чынам, у сваім развіцці мемуарыстыка, з аднаго боку, абапіралася на дасягненні мастацкай літаратуры, а з другога боку, мела на яе зваротнае ўздзеянне.

Ва «Успамінах з жыцця» Евы Фялінскай удала спалучаюцца вобраз эпохі, працэсуальнасць гісторыі, паказаныя праз прыватнае сямейнае жыццё, і гісторыя інтэлектуальна-духоўнага станаўлення асобы. Яе «Успаміны» зрабілі істотны ўнёсак у назапашванні вопыту мемуарнага жанру, які ў перспектыве будзе набываць усё большую папулярнасць. Майстэрства перадачы жыццёвай канкрэтыкі, вопыт самааналізу, дакладнасць эмацыянальна-псіхалагічнага малюнка былі прадуктыўнымі для далейшага літаратурнага развіцця і, у прыватнасці, станаўлення лірычнай прозы і рэалізму як мастацкага стылю.